# ПТУШКАГАДОЎЧАЯ ФЕРМА СТАЛА РЭНТАБЕЛЬНАЙ

РЭНТАБЕЛЬНАСЦЬ птушкагадоўлі, як і кожнай іншай галіны жывёлагадоўлі, залежыць ад прадуктыўнасці пагалоўя. Аб гэтым пераканаўча гаворыць вопыт саўгаса «Старобінскі». Спецыялізавацца на вытворчасці яек мы пачалі яшчэ ў 1965 годзе, гэта значыць да стварэння саўгаса. Ужо тады на птушкагадоўчай ферме налічвалася сем тысяч курэй-нясушак. За год ад кожнай курыцы-нясушкі было атрымана ў сярэднім па 122 яйкі. Зразумела, што такая прадуктыўнасць пагалоўя высокіх даходаў прынесці не магла. Аднак і страт ад птушкагадоўчай фермы ўжо ў першы год спецыялізацыі гаспадарка не мела.

Спецыялізацыя дазволіла нам з году ў год павялічваць вытворчасць яек. Калі ў 1966 годзе птушкагадоўчая ферма дала 1.246 тысяч яек, то летась было атрымана 1.314 тысяч яек. За першы квартал сёлетняга года птушкаводы саўгаса сабралі 393,4 тысячы яек. Рост вытворчасці яек дасягнут не за кошт павялічэння пагалоўя курэй-нясушак, а за лік павышэння іх прадуктыўнасці. Калі ў 1966 годзе ад кожнай курыцы-нясушкі было атрымана па 179,3 яйка, то летась мы мелі ўжо 189,6 яйка, а за тры месяцы сёлетняга года — па 41,7 яйка. Хочацца адзначыць, што калі да спецыялізацыі асноўную масу прадуктаў птушкагадоўлі наша гаспадарка атрымлівала ў вясеннелетні перыяд, то цяпер вытворчасць яек ідзе раўнамерна на працягу года. Восенню і зімой яйцаноскасць курэй утрымліваецца на ўзроўні летніх месяцаў.

Гэты поспех не выпадковы. Нашы птушкаводы ў сваёй рабоце шырока выкарыстоўваюць дасягненні навукі і перадавога вопыту, удасканальваюць метады кармлення і ўмовы ўтрымання курэй-нясушак, а таксама маладняку. У рацыёнах кармлення ўтрымліваецца дастаткова бялкоў, тлушчаў і вугляводаў, а таксама вітамінаў і мінеральных рэчываў. У сутачны рацыён для дарослай птушкі ўваходзіць 120 грамаў камбікорму, 50 грамаў морквы, 10 грамаў тварагу або мяса. Даём таксама ракавінкі, зелень, мел і інш.

Маладняк для вырошчвання мы атрымліваем са Старобінскай інкубатарна-птушкагадоўчай станцыі. Штогод завозім на ферму па 25 тысяч куранят. Пры гэтым куранят атрымліваем у сутачным узросце і імкнемся браць іх не пазней сакавіка месяца. Як паказаў вопыт, куранята, атрыманыя ў першыя месяцы года, хутка растуць і лепш развіваюцца, больш устойлівыя да розных захворванняў, а галоўнае — ужо ў гэтым жа годзе пачынаюць яйцакладку.

Для забеспячэння лепшага развіцця, куранята атрымліваюць корм, у які ўваходзіць тварог, вараныя яйкі, камбікорм, моркаў і інш. Такое кармленне забяспечвае хуткі рост маладняку. Калі куранята дасягаюць двухтыднёвага ўзросту, праводзім іх сартыроўку. Пеўнікаў аддзяляем і здаём для адкорма на Слуцкі птушкакамбінат жывою вагою 700—750 грамаў, а маладняк, прызначаны для ўзнаўлення статка, перадаём птушніцам для дагадоўвання. Захаванасць маладняку ў мінулым годзе склала 92,7 працэнта.

Як вядома, куры найбольш прадуктыўны ў першы год яйцаноскасці. Вось чаму кожны год мы абнаўляем статак. З дня атрымання з інкубатарнай станцыі і да здачы на мясакамбінат, кура-нясушка знаходзіцца ў гаспадарцы 18—19 месяцаў. Уся дарослая птушка ўтрымліваецца на глыбокім незмяняемым падсцілу.

Разам з павялічэннем вытворчасці прадукцыі птушкагадоўлі, зніжаецца яе сабекошт, расце прыбытак ад гэтай галіны гаспадаркі. Калі ў 1966 годзе дзесятак яек абыйшоўся саўгасу ў 60,4 капейкі, то летась ён склаў толькі 55 капеек. Такі ж сабекошт дзесятка яек і за першы квартал сёлетняга года. Птушкагадоўчая ферма прынесла летась 51,3 тысячы рублёў чыстага прыбытку. Добра ідуць справы і цяпер. За першы квартал птушкагадоўля дала гаспадарцы 11,6 тысячы рублёў чыстага прыбытку.

Нашы птушкаводы матэрыяльна зацікаўлены ў павелічэнні вытворчасці яек, захаванні маладняку. За выкананне гадавога плана яйцаноскасці яны атрымліваюць дадатковую аплату. Сярэднемесячны заработак даглядчыцы птушкі складае 100—150 рублёў.

Птушкаводы саўгаса «Старобінскі» прыкладаюць усе намаганні да таго, каб з кожным годам павялічваць вытворчасць яек і птушынага мяса, дастойна сустрэць 50-годдзе БССР і Кампартыі Беларусі.

**М. ЗЯНОВІЧ,**
**галоўны заатэхнік саўгаса «Старобінскі».**